ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

ЛІСТАПАД СНЕЖАНЬ

Віцебск 2017

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Лістапад–снежань 2017

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК
2018

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *Т. В. Пацалуёнак*
Рэдактар *А. В. Ігнаценка*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : лістапад-снежань : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ; [склад. Т. В. Пацалуёнак]. – Віцебск, 2017. – 42 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2018

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Лістапад–снежань 2017

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнік **Пацалуёнак** Таццяна Віктараўна

Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: kray@vlib.by, vlib@vlib.by

ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную па матэрыялах абласной газеты «Витебские вести», гарадскіх і раённых газет Віцебскай вобласці за перыяд з 1 лістапада па 31 снежня 2017 года, і ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці і цэнтральнымі бібліятэкамі вобласці.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

Юбілейныя мерапрыемствы з нагоды 419-й гадавіны горада Барань Аршанскага раёна праходзілі ў два этапы. **1 лістапада** на сцэне Палаца культуры адбыўся канцэрт «Дети – твое будущее, город!» з удзелам таленавітай моладзі школ, гімназіі, ДШМ № 3, Палаца культуры. **3 лістапада** прайшла ўрачыстая вечарына «Віншуем родны горад з нараджэннем!», якая сабрала ў вялікай зале Палаца культуры ветэранаў працы і жыхароў горада. Былі ўручаны Ганаровыя граматы Аршанскага райвыканкама і Бараньскага гарвыканкама, з канцэртнымі нумарамі выступілі творчыя калектывы Оршы і Барані. У фае Палаца культуры ў святочныя дні працавалі выставы: майстра-разьбяра па дрэве Аляксандра Баброва, школьных фатаграфій «Город глазами детей», творчых работ навучэнцаў мастацкага аддзялення ДШМ № 3 і інш.

7 лістапада адзначалася **100-годдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі**. Установы культуры вобласці прынялі актыўны ўдзел у святкаванні гэтай знамянальнай даты. Напярэдадні юбілею ў Віцебскай абласной філармоніі адбыўся ўрачысты канцэрт. 7 лістапада ў абласным цэнтры прайшоў мітынг ля помніка У. І. Леніну. У Полацку юбілейнай даце была прысвечана патрыятычная акцыя «Нам продолжать историю города!», праведзеная ля падножжа Кургана Бессмяротнасці. Артысты Аршанскага ГЦК «Победа» сабралі прадстаўнікоў розных пакаленняў на святочны канцэрт «Песни рождают эпохи…». У Гарадоцкім Доме культуры было арганізавана свята гістарычнага календара «Страницы истории листая», удзельнікі якога пабывалі ў атмасферы савецкіх гадоў. На святкаванні ў актавай зале Шумілінскай СШ № 1 адбылося ўшанаванне працоўных

прыкладной творчасцю. Таксама былі прадэманстраваны знятыя кінастудыяй сацыяльныя ролікі на тэму пажарнай бяспекі і шкоды курэння.

16 снежня ў Полацкім гарадскім Палацы культуры адбылося ўрачыстае закрыццё IV адкрытага конкурсу аматарскіх фільмаў імя Юрыя Тарыча, у якім удзельнічалі аўтары з Беларусі, Расіі, Латвіі і Германіі. Прызавых дыпломаў былі ўдастоены 40 работ.

МЕРАПРЫЕМСТВЫ,

якія не ўвайшлі ў папярэдні выпуск

14 кастрычніка ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці Дубровенскага раёна былі запрошаны на святкаванне 305-годдзя г. Вулканешты (Малдова). Сваімі выступленнямі парадавалі жыхароў самага паўднёвага горада Гагаузіі вакальная група «Спатканне» Дубровенскага аўтаклуба і ўдзельніца народнай студыі «Ліра» раённага Дома культуры Наталля Еслікава. (*Дняпроўская праўда. – 2017. – 8 лістап. – С. 7.)*

21 кастрычніка ў Пастаўскай дзіцячай школе мастацтваў імя Альфрэда Ромера адбыўся рэгіянальны восеньскі пленэр, у якім прынялі ўдзел 40 навучэнцаў мастацкіх школ з Пастаўскага, Глыбоцкага і Докшыцкага раёнаў. (*Пастаўскі край. – 2017. – 11 лістап. – С. 8.*)

40-гадовы юбілей адзначыў Дом культуры аграгарадка Копці Віцебскага раёна. (*Витебские вести. – 2017. – 4 нояб. – С. 13.*)

Беларусь Уладзіміра Байдава. Сваю тэатральна-музычную пастаноўку «Сем колераў кахання для Шагала, Паэта і Аркестра» музыканты прысвяцілі 130-годдзю з дня нараджэння мастака.

Выхаванка музычнай студыі «Альтанка» Віцебскага гарадскога цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Ганна Стаян атрымала галоўны прыз Міжнароднага конкурсу выканаўцаў маладзёжнай эстраднай песні ў польскім горадзе Кельцэ. Ёй прысуджана першае месца ва ўзроставай катэгорыі 9–12 гадоў.

1 снежня ў Цэнтры культуры «Віцебск» стартаваў рэгіянальны адбор беларускага тура для ўдзелу ў XXVII Міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2018» і XVI Міжнародным дзіцячым конкурсе ў рамках фестывалю «Славянскі базар у Віцебску».

4 снежня на сцэне тэатра імя Я. Коласа перад прыхільнікамі джазавай музыкі выступілі знакаміты амерыканскі саксафаніст, уладальнік музычнай прэміі «Грэмі» Майран Уолдэн і гурт «New York Quartet».

У віцебскім культурна-дзелавым цэнтры «Першамайскі» адбыўся святочны канцэрт, прысвечаны 70-годдзю народнага духавога аркестра. Калектыў быў заснаваны ў 1947 годзе ў Палацы культуры домабудаўнічага камбіната. На працягу апошніх трыццаці гадоў аркестрам кіруе саксафаніст, былы музыкант ваеннага аркестра Валерый Лебедзеў.

Народны жаночы камерны хор Цэнтра культуры г. Наваполацка ўрачыста адзначыў 10-гадовы юбілей. У канцэртнай праграме юбілейнай вечарыны прагучалі творы рускіх, беларускіх, савецкіх кампазітараў. Прэм'ерай стаў твор канцэртмайстра хору Леаніда Маліноўскага «Вакаліз» у выкананні салісткі хору Ілоны Марозавай.

КІНАМАСТАЦТВА

Кінавечар, праведзены **25 лістапада** народнай кінастудыяй «Летапіс» Талачынскага раённага Цэнтра культуры, быў прысвечаны творчым людзям раёна, якія займаюцца тэхнічнай і дэкаратыўна-

дынастый раёна, агульны стаж кожнай з якіх склаў больш за сто гадоў. На ўрачыстым мерапрыемстве ў Шаркаўшчынскім раённым Цэнтры культуры быў наладжаны канцэрт «Судьба и Родина – едины», дэманстраваўся відэафільм «100 лет Октября». У Талачынскім Цэнтры культуры адбыўся святочны канцэрт «О прошлом для будущего». Сустрэча пад назвай «Погляд праз стагоддзе» з удзелам ветэранаў і актывістаў маладзёжнага руху была праведзена ў памяшканні Міёрскай раённай бібліятэкі. У Бешанковіцкай ЦРБ была праведзена гадзіна гістарычнай памяці «На рубеже эпох» для старшакласнікаў.

У шэрагу рэгіёнаў вобласці ў рамках святкавання 100-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі былі распячатаны капсулы са зваротамі да нашых сучаснікаў, якія закладваліся паўвека назад. Лісты з мінулага былі перададзены ў музеі. Адначасова адбылася закладка пасланняў будучым нашчадкам. Такія ўрачыстыя цырымоніі былі праведзены ў Полацку, аграгарадку Каханавічы Верхнядзвінскага раёна, аграгарадку Акцябрская Віцебскага раёна. 43 гады чакала пасланне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны моладзі XXI стагоддзя, замураванае ў сцяне будынка Лёзненскага раённага ваенна-гістарычнага музея.

16 лістапада ў Полацкім гарадскім Палацы культуры адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 1025-годдзю Полацкай епархіі. У рамках мерапрыемства была арганізавана выстава-прысвячэнне «Летопись Полоцкой епархии», у канцэртнай праграме выступілі творчыя калектывы і выканаўцы са шматлікіх прыходаў епархіі.

19 лістапада працаўнікі сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу адзначылі сваё прафесійнае свята. Лепшыя творчыя калектывы і выканаўцы Віцебшчыны прымалі актыўны ўдзел у віншаванні перадавікоў сельскагаспадарчай галіны. Маштабнае раённае свята «Хвала і пашана вам, хлебаробы!» адбылося ў Гарадоцкім ГДК. На мерапрыемства былі запрошаны таксама ветэраны працы і маладыя спецыялісты. Па традыцыі іх віталі на сцэне, уручыўшы падарункі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі

райвыканкама. Шумілінскія аграрыі сабраліся на святочным мерапрыемстве ў Лаўжанскім сельскім Цэнтры культуры і вольнага часу. Іх увазе была прадстаўлена выстава гісторыка-краязнаўчага музея, прысвечаная гісторыі працоўных дасягненняў вяскоўцаў раёна. Выставу раённага конкурсу «Залаты сноп» майстры Дома рамёстваў дапоўнілі цікавым прадстаўленнем, якое прадэманстравала сімволіку народных абрадаў, звязаных з Дажынкамі. Самадзейныя артысты УП «Віцебскаблгаз» выступілі з цудоўным канцэртам. Г. п. Арэхаўск Аршанскага раёна стаў цэнтрам ушанавання сельскагаспадарчых вытворцаў. На плошчы быў арганізаваны святочны кірмаш, у мясцовым Доме культуры прайшлі цырымонія ўзнагароджання лепшых працаўнікоў галіны і вялікі канцэрт творчых калектываў Аршаншчыны. Урачыстае мерапрыемства ў гонар верхнядзвінскіх аграрыяў праходзіла ў Валынецкім СДК. Святочны настрой стварылі творчыя калектывы Верхнядзвінскага РЦКНТ і артысты ансамбля «Сударушка» з г. п. Ідрыца Себежскага раёна Пскоўскай вобласці. Адметным падарункам удзельнікам раённага свята ў Глыбокім стала выступленне Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча. Супрацоўнікі Дубровенскага РДК падрыхтавалі да свята цікавае тэатралізаванае прадстаўленне, дзе знайшлося месца і праўдзе жыцця, і трапнаму гумару, і словам падзякі.

У г. п. Балбасава Аршанскага раёна прайшоў дзень памяці лётчыка-героя Сяргея Іванавіча Грыцаўца. Удзел прыняла дэлегацыя з Расіі – прадстаўнікі фонду «Победитель» па ўвекавечанні памяці герояў Айчыны імя першага двойчы Героя Савецкага Саюза С. І. Грыцаўца. Госці перадалі жыхарам пасёлка бюст героя, частку дакументаў і асабістую справу Сяргея Іванавіча. У мясцовым Доме культуры быў праведзены ўрок мужнасці і пашаны «Рожденный для неба», да помніка лётчыку былі ўскладзены вянкі і кветкі. (*Аршанская газета. – 2017. – 14 лістап. – С. 1.*)

Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Баларусі папоўніўся традыцыйнай стравай Віцебскай вобласці «Клёцкі з душамі» і

арганы Пастаўшчыны» ў касцёле Святога Антонія Падуанскага ў Паставах і касцёле Святога Яна Хрысціцеля ў Камаях. У канцэрце «Шэдэўры класічнай музыкі» прынялі ўдзел арганіст мінскага касцёла Найсвяцейшай Тройцы Віктар Кісцень, салістка Беларускай дзяржаўнай філармоніі Тамара Рэмез і трубач Аляксандр Ахрэмка – саліст Цірольскага аркестра (Аўстрыя).

У канцэртнай праграме XXII Міжнароднага фестывалю арганнай музыкі «Званы Сафіі», які праходзіў **на працягу лістапада** ў канцэртнай зале Полацкага Сафійскага сабора, выступілі арганісты Мікалай Гершак (Германія), Юзэф Катовіч (Польшча), расійскія выканаўцы Анастасія Быкава (арган), Тамара Ягорава (скрыпка), беларускія музыканты Ксенія Пагарэлая (арган), Віктар Бабенка (скрыпка), камерны аркестр «Еўропа-Цэнтр». Завяршыўся фестываль **26 лістапада** канцэртам Ёргена Ліндстрома (арган, Швецыя).

1 снежня ў Цэнтры культуры «Віцебск» стартаваў рэгіянальны адбор беларускага тура для ўдзелу ў XXVII Міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2018» і XVI Міжнародным дзіцячым конкурсе ў рамках фестывалю «Славянскі базар у Віцебску».

4 снежня на сцэне тэатра імя Я. Коласа перад прыхільнікамі джазавай музыкі выступілі знакаміты амерыканскі саксафаніст, уладальнік музычнай прэміі «Грэмі» Майран Уолдэн і гурт «New York Quartet».

4–17 снежня ў Віцебску адбыўся XXIX Міжнародны музычны фестываль імя І. Салярцінскага. Фестываль адкрыў Дзяржаўны сімфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам Аляксандра Анісімава. У рамках фестывалю прайшлі чытанні, прысвечаныя 115-годдзю з дня нараджэння Івана Іванавіча Салярцінскага. У іх удзельнічалі мастацтвазнаўцы і даследчыкі з Беларусі, Расіі і Латвіі. У фестывальнай афішы – вечар рускай музыкі з удзелам скрыпача Максіма Фядотава і піяністкі Галіны Пятровай, канцэрт ансамбля салістаў «Spark» з Германіі. Завяршыла фестываль выступленне ансамбля салістаў «Классик-Авангард» пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі

«Парася, якое спявае» (для дзяцей). У сваю чаргу маладзечанскі глядач убачыў у гэтыя дні спектаклі коласаўцаў: камедыі «Самая жаданая» па п'есе С. Гіргеля, «Што баліць?» Л. Агулянскага і музычную казку для дзяцей «Сіўка-Бурка» Я. Тарасава.

У другой палове **снежня** на коласаўскай сцэне праходзілі прэм'ерныя спектаклі «Прыгоды Чыпаліна» па казцы Джані Радары. Сцэнічную версію казкі ўвасобіла актрыса і рэжысёр Ірына Цішкевіч. У ролях: Раіса Грыбовіч, Юрась Цвірка, Яўген Бераснеў, Галіна Букаціна, Пятро Ламан, Віктар Дашкевіч і іншыя.

У рэпертуары Беларускага тэатра «Лялька» з'явіўся новы спектакль пад назвай «Мой Надзейны Сябра: 101», створаны пры падтрымцы Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС. Пастаноўка Віктара Клімчука. Мастак-сцэнограф – Дар'я Дубовік. У галоўнай ролі – Марына Марозава. У спектаклі занятыя: Вольга Маханькова, Алег Рыхтэр, Ларыса Мартынава, Ганна Сцепанец і Валерый Зімніцкі. Прэм'ера адбылася **21 і 22 лістапада**.

Да навагодніх святаў віцебскія лялечнікі падрыхтавалі спектакль «З Новым годам, добры Гном!», які паставіў мастацкі кіраўнік Беларускага тэатра «Лялька» Віктар Клімчук. Мастак Вячаслаў Шайнураў. Пастаноўку танцавальна-забаўляльнай праграмы «У гасцях у Дзеда Мароза» здзейсніла Дар'я Зімніцкая. Мастак Аксана Нікеенка.

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

18–19 лістапада ў Наваполацку ў 15-ы раз прайшоў конкурс юных выканаўцаў эстраднай песні «Халі-Хало», які ў гэтым годзе набыў статус міжнароднага. Ён сабраў 56 таленавітых выканаўцаў ва ўзросце ад 8 да 16 гадоў з сямі краін – Беларусі, Расіі, Латвіі, Эстоніі, Украіны, Малдовы, Румыніі. Журы на чале з заслужанай артысткай Беларусі Ірынай Дарафеевай прысудзіла Гран-пры 12-гадоваму мінчаніну Мікіту Бялько.

25 лістапада адбылося музычнае свята «Гучаць старадаўнія

вясельнымі звычаямі Дубровеншчыны. Такое рашэнне было прынята **15 лістапада** на пасяджэнні Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Беларусі.

28 лістапада ў Шаркаўшчыне адбылася ўрачыстая цырымонія ўручэння дыпломаў і медалёў лаўрэатам ганаровага звання «Праведнік народаў свету». Узнагароды прысуджаны прадстаўнікам пяці сем'яў пасмяротна. Іх атрымалі з рук Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь Алана Шогама нашчадкі выратавальнікаў яўрэяў у гады Вялікай Айчыннай вайны. У фае райвыканкама былі прадстаўлены выстава мастакоў на тэму Халакосту «Памяць без тэрміну даўнасці» і Міжнародная фотавыстава «Мы з Беларусі».

10 снежня ў абласным цэнтры прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя 25-годдзю адраджэння Віцебскай епархіі. Удзел ва ўрачыстасцях прыняў мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыярх Экзаршы ўсея Беларусі Павел. У Віцебскай абласной філармоніі быў арганізаваны святочны вечар, на якім архіепіскап Віцебскі і Аршанскі Дзімітрый адзначыў актыўную дапамогу, якую на працягу чвэрці стагоддзя аказвалі Віцебскай епархіі дзеячы культуры і мастацтва. Юбілейнымі граматамі былі ўзнагароджаны: дырэктар Віцебскай абласной філармоніі Алена Падаляк, заснавальнік Віцебскага народнага гарадскога маладзёжнага хору, хормайстар, выкладчык Віталь Рауза, рэжысёр і выкладчык Ігар Баярынцаў.

У снежні праходзіў раённы семінар ідэалагічнага актыву Сенненшчыны. Прадстаўнікі працоўных калектываў пазнаёміліся з дзейнасцю раённага Дома рамёстваў. Для ўдзельнікаў семінара была арганізавана экскурсія па выставачных залах, многія маглі паспрабаваць сябе за ткацкім станком і прайсці майстар-клас ад ткачыхі Іны Стычынскай. Другая частка семінара прайшла на базе Сенненскай дзіцячай школы мастацтваў.

29 снежня ў Лёзненскім раённым Цэнтры культуры адбылося ўручэнне III творчай прэміі «Сунічка-2017». Удзел у цырымоніі прынялі начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Г. М. Ягораў і прадстаўнікі раённых улад. Уручэнне ўзнагарод у розных намінацыях чаргавалася з музычнымі і танцавальнымі нумарамі.

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

7–8 лістапада Міёрскі раён наведала польская дэлегацыя ў складзе Саветніка Пасольства Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь Міхала Хабраса, бургамістра горада і гміны Гоняндз Падляшскага ваяводства Марыюша Раматоўскага, інспектара Адміністрацыі Аркадзіуша Студнярэка. Мэта – наладжванне ўзаемавыгадных дзелавых кантактаў у эканамічнай, турыстычнай і культурнай сферах. Госці наведалі візіт-цэнтр «Ельня», у суправаджэнні гісторыка Вітольда Ермалёнка пазнаёміліся з вартасцямі самага маленькага горада Беларусі – Дзісны, ушанавалі памяць польскіх салдат, пахаваных у в. Драгуны. У сумесных планах – рэстаўрацыйныя работы па аднаўленні гістарычнай рэліквіі – калоны ў Лявонпалі. Гэта адзін з нямногіх помнікаў, прысвечаных Канстытуцыі Рэчы Паспалітай 1791 года. Вынікам візіту стала падпісанне дагавору аб партнёрскім супрацоўніцтве паміж Міёршчынай і гмінай Гоняндз.

Дэлегацыя Глыбоцкага райвыканкама наведала з візітам горад Уварава Тамбоўскай вобласці. Ва ўрачыстай абстаноўцы, у рамках Дня горада Уварава, адбылося падпісанне Пагаднення аб устанаўленні сяброўскіх адносін паміж гарадамі Глыбокае і Уварава. Прадугледжана доўгатэрміновае супрацоўніцтва ў галіне адукацыі, культуры, спорту, турызму і інш. Плануецца ўстанаўленне прамых партнёрскіх сувязяў паміж культурнымі ўстановамі, падтрымка развіцця ўзаемнага інтарэсу да культуры і гісторыі рэгіёнаў. (*Веснік Глыбоччыны. – 2017. – 11 лістап. –*

лёзненскімі майстрыхамі Ірынай Церашковай і Жанай Ілюшкінай, **на працягу снежня** экспанавалася ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі.

8 снежня ў Пастаўскім Доме рамёстваў «Стары млын» адкрылася выстава «Час анёлаў». Яе аўтары – член Саюза мастакоў Расіі Алена Вайнова-Багародзіцкая і мясцовы фатограф Рыта Шылей. У экспазіцыі – легкакрылыя анёлы і фотаздымкі дзяцей з асаблівасцямі развіцця.

У снежні на выставу наваполацкага ювеліра-гравёра Сяргея Данілава запрасіла выставачная зала Музея гісторыі і культуры Наваполацка. У экспазіцыі пад назвай «Art metal» прадстаўлены вытанчаныя вырабы з металу: статуэткі, посуд, упрыгажэнні, барэльефы.

Выстава дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Карнавал масак» адкрылася **ў снежні** ў выставачнай зале АМЦНТ. У экспазіцыі – навагоднія і калядныя маскі, сувеніры, елачныя упрыгожанні, вырабленыя майстрамі з усёй вобласці.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

11 лістапада Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа прыняў удзел у VII Міжнародным фестывалі камерных тэатраў і спектакляў малых форм «ArtОкраина» ў г. Санкт-Пецярбургу з пастаноўкай Ірыны Цішкевіч «Каралева прыгажосці з Лінэна» М. Мак-Донаха.

21 лістапада, у дзень заснавання коласаўскага тэатра, адбылася прэм'ера спектакля «Апошнія» па п'есе М. Горкага ў пастаноўцы мастацкага кіраўніка коласаўцаў Міхася Краснабаева. Мастак-пастаноўшчык – Святлана Макаранка. У спектаклі занятыя: Георгій Лойка, Яўген Лук'янаў, Алена Шарэпчанка, Уладзіслаў Жураўлёў, Вікторыя Шамардзіна, Святлана Сухадолава, Святлана Акружная, Вячаслаў Грушоў і інш.

7–8 снежня на сцэне тэатра імя Я. Коласа прайшлі гастролі Мінскага абласнога драматычнага тэатра (г. Маладзечна). У гастрольнай афішы: спектаклі для дарослых «Красуні», «Дыягназ – каханне!» і

харэограф Дмітрый Залескі (Мінск) узнагароджаны спецыяльнай прэміяй імя Яўгена Панфілава.

Узорны ансамбль танца «Егоза» Цэнтра культуры «Віцебск» адзначыў сваё 20-годдзе выступленнем у Канцэртнай зале «Віцебск». Святочная праграма ўключала народныя і сучасныя танцы, ужо вядомыя і зусім новыя пастаноўкі калектыву.

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

10 лістапада – 10 снежня ў Смаленскім цэнтры народнай творчасці была адчынена для наведвальнікаў абменная выстава твораў майстроў Віцебшчыны «Віцебская кераміка». У экспазіцыі – 250 вырабаў лепшых майстроў-керамістаў з Ушацкага, Сенненскага, Шумілінскага, Чашніцкага, Талачынскага, Дубровенскага раёнаў Віцебшчыны і з фондаў Віцебскага АМЦНТ. Вырабы з саломкі былі прадстаўлены пераважна майстрамі з Чашніцкага і Талачынскага Дамоў рамёстваў.

17 лістапада ў выставачнай зале Віцебскага АМЦНТ адкрылася выстава «Віцебская маёліка Людмілы Кавальчук», на якой былі прадстаўлены ўнікальныя аўтарскія работы майстра-кераміста з Віцебска.

У выставачнай зале Новалукомльскага Палаца культуры экспанавалася персанальная выстава майстра саломапляцення Зінаіды Елісеевай. Выстава прымеркавана да яе 70-гадовага юбілею. Майстар стварыла звыш 500 саламяных акладаў для абразоў, ёй прасуджана спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» ў намінацыі «Народная творчасць», уручаны памятны медаль «2000 год хрысціянству».

24 лістапада ў выставачнай зале Наваполацкага Цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры адкрылася выстава «Неакрэсленае». Аўтары экспазіцыі – майстар-дызайнер валяння з воўны Кацярына Фядотава і майстар роспісу па дрэве і тканіне Марына Іванова.

Выстава маляванкі і набіванкі «Сузор'е фарбаў», выкананых

С. 5–6.)

17 лістапада Гарадок наведала дэлегацыя з гарадскога пасялення Дзядзенева Дзмітраўскага муніцыпальнага раёна Маскоўскай вобласці. Падпісана двухбаковае пагадненне аб супрацоўніцтве ў розных сферах, у тым ліку ў галіне культуры (прадугледжана культурнае ўзаемадзеянне творчых калектываў і музеяў). Расійскія госці ў час экскурсіі па Гарадку наведалі краязнаўчы музей, Дом рамёстваў і фальклору, прынялі ўдзел ва ўшанаванні лепшых працаўнікоў раённага АПК. (*Гарадоцкі веснік. – 2017. – 21 лістап. –С. 21.*)

Гран-пры IV адкрытага міжрэгіянальнага тэатральнага фестывалю імя А. Д. Папанава заваяваў народны аматарскі тэатр Аршанскага гарадскога Цэнтра культуры «Победа» (кіраўнік Васіль Мігаль). На малой радзіме вялікага артыста – у Вязьме Смаленскай вобласці – аршанцы паказалі камедыю «І смех, і грэх» па п'есе Я. Купалы. Аршанская актрыса Наталля Юсухна ўзнагароджана дыпломам «За лепшую жаночую ролю».

Ансамбль «Купалінка» Даўгаўпілскага Цэнтра беларускай культуры (Латвія) пабываў на майстар-класе па фальклорных спевах у Браслаўскім раённым Цэнтры культуры. Заняткі праводзіла вопытны хормайстар, кіраўнік народнага ансамбля песні «На панадворку» Марына Шыркевіч. **24 лістапада** ў канцэртнай зале Дома адзінства г. Даўгаўпілса прайшоў VII Міжнародны фестываль народнай культуры «Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе». У ім прынялі ўдзел майстры Браслаўскага раённага аб'яднання музеяў і народны ансамбль беларускай песні «На панадворку» Браслаўскага РЦК. Спевакі з Браслава і Міёр прадстаўлялі песенныя скарбы беларускай культуры ў гала-канцэрце. Іх запрасілі на падобныя фестывалі ў Літву і Эстонію. Прадстаўнікі Глыбоччыны прывезлі ў Даўгаўпілс вырабы майстроў раённага Дома рамёстваў.

25 лістапада ў танцавальнай зале Глыбоцкага ГДК ладзілася этнавечарына, удзельнікамі якой былі фальклорныя калектывы Глыбоччыны і Пастаўшчыны, народныя майстры, госці з Балтыі. Арганізатарамі выступілі супрацоўнікі Глыбоцкага гісторыка-

этнаграфічнага музея. Вечарына «Госць на госць, а гаспадару – радасць» праводзілася ў рамках мясцовай ініцыятывы «Стварэнне віртуальных падарожжаў па гісторыка-культурнай спадчыне рэгіёна» праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН (ПРААН). (*Веснік Глыбоччыны. – 2017. – 29 лістап. – С. 4.*)

Напрыканцы лістапада дэлегацыя Расоншчыны наведала Вілякскі край Латвіі. У ходзе візіту быў падпісаны дагавор аб супрцоўніцтве ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай і гуманітарна-культурнай сферах паміж Расонскім раёнам і Вілякскім краем.

Старшыня Глыбоцкага райвыканкама Алег Морхат у выніку паездкі ў Адэскую вобласць (Украіна) падпісаў Дагавор аб супрацоўніцтве паміж гарадамі Глыбокае і Балта. У шэрагу іншых прадугледжана рэалізацыя сумесных культурна-гуманітарных праграм і праектаў.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

Калектыў аўтаклуба аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Чашніцкага райвыканкама разам з бібліятэкамі і клубнымі ўстановамі раёна праводзіць вялікую работу па адраджэнні і захаванні народных традыцый. Да свята «Дзяды» ў Гілянскай сельскай бібліятэцы-клубе быў прадэманстраваны абрад памінальнай суботы.

9 лістапада ў Наваполацкім Цэнтры культуры адбылася гарадская духоўна-асветніцкая канферэнцыя, прысвечаная 1025-годдзю ўтварэння Полацкай епархіі. У рамках мерапрыемства адбылося ўручэнне Падзячных лістоў Наваполацкага гарвыканкама за асабісты ўклад у духоўна-маральнае развіццё і выхаванне жыхароў горада. Сярод узнагароджаных – хормайстар народнага жаночага камернага хору Цэнтра

Рэспублікі ў Беларусі з нагоды 500-годдзя выдання «Бібліі» Францыскам Скарынам. На адкрыцці прысутнічаў пасол Чэшскай Рэспублікі ў Беларусі Мілан Экерт.

ХАРЭАГРАФІЯ

4 лістапада ў Канцэртнай зале «Віцебск» адбыўся вялікі канцэрт Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь харэаграфічнага ансамбля «Зорька». У канцэртнай праграме «Мы – дети солнца» звыш 170 юных артыстаў прадставілі на суд гледачоў і кампетэнтнага журы 17 танцаў. Па выніках канцэрта было прынята рашэнне пацвердзіць званне заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь харэаграфічнаму ансамблю «Зорька».

15–19 лістапада ў Віцебску прайшоў XXX Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі. Гісторыі IFMC была прысвечана выстава-інсталяцыя «Музей-архив». У холе Канцэртнай залы «Віцебск» размясціліся экспазіцыі фатографа Ганны Майсяюк і мастака Аляксандра Салівончыка. Сапраўдным падарункам стала прэзентацыя фільма «После тебя», які прадставілі рэжысёр Ганна Мацісон і выканаўца галоўнай ролі Сяргей Бязрукаў. Сваімі выступленнямі парадавалі гледачоў тэатр «Балет Евгения Панфилова», «Эксцентрик-балет» Сяргея Смірнова, тэатр «Балет Москва», тэатр «Киев модерн-балет» і інш. У беларускім конкурсе сучаснай харэаграфіі прынялі ўдзел 20 танцавальных калектываў. Міжнароднае журы, у якім працавалі прадстаўнікі Беларусі, Украіны, Аўстрыі, Румыніі, Польшчы, узначальваў заслужаны дзеяч мастацтваў Украіны, народны артыст Малдовы Раду Паклітару. Першая прэмія прысуджана конкурснай рабоце «Смотри, а то услышишь…» тэатра-студыі сучаснай харэаграфіі Цэнтра культуры «Віцебск» у пастаноўцы Дзіяны Юрчанкі. Віцебскі харэограф удастоена спецыяльнай узнагароды за значны ўклад у развіццё сучаснай харэаграфіі і адданасць мастацтву, устаноўленай аргкамітэтам у гонар юбілейнага фестывалю. На IFMC-2017

экспанавалася выстава жывапісу «Мой выбар» з калекцыі Мікалая Сінякова.

Выстава «Лед. Огонь. Вода» ў Культурна-гістарычным комплексе «Залатое кольца горада Віцебска «Дзвіна» была прысвечана 80-годдзю мастака Яна Прыса – аднаго са старэйшых удзельнікаў віцебскага народнага клуба самадзейных мастакоў «Контур». Акрамя карцін юбіляр прадставіў і свае творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

1 снежня ў выставачнай зале музея гісторыі і культуры Наваполацка адкрылася выстава з фондавых калекцый установы. У экспазіцыі «Настаўнік і вучні» прадстаўлены работы выдатнага акварэліста, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Івана Міхайлавіча Сталярова і карціны яго вучняў.

Да 10 снежня ў Мастацкай галерэі Полацка экспанавалася выстава «Вобразы Рыма ў афортах» Д.-Б. Піранезі (1720–1778) і Л. Расіні (1790–1857), адкрытая ў кастрычніку. Выстава праходзіла ў рамках міжнароднага супрацоўніцтва Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка і Наўгародскага дзяржаўнага музея-запаведніка. Экспазіцыя падрыхтавана на аснове калекцыі, падоранай музею-запаведніку наўгародскім калекцыянерам эстампаў і мецэнатам Аляксандрам Адзінокавым.

ФОТАМАСТАЦТВА

У выставачнай зале Культурна-гістарычнага комплексу «Залатое кольца горада Віцебска «Дзвіна» экспанавалася фотавыстава «Красота особенного материнства». Фотапраект быў прымеркаваны да Міжнароднага дня інвалідаў з мэтай прыцягнення ўвагі да жыцця сем’яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў.

У снежні ў Мастацкай галерэі Полацка адкрылася фотавыстава «Беларуская Прага». Гэта ўнікальны праект, які рэалізаваны мінскай фотамастачкай Юліяй Мацкевіч пры падтрымцы Пасольства Чэшскай

культуры Галіна Доўжык, ветэран працы ЦБС г. Наваполацка Фаіна Жураўлёва, выкладчыкі Наваполацкага музычнага каледжа Алена Васільева і Міхаіл Каптур, кіраўнік узорнага ансамбля танца і песні «Прыдзвінскія россыпы» Цэнтра культуры Святлана Фядотава.

9 лістапада ў вялікай зале КДЦ «Першамайскі» абласнога цэнтра было праведзена літаратурна-музычнае свята «Жыве ў сэрцы плынь крыніц...», прысвечанае 135-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа. Дзіцячая бібліятэка імя Я. Коласа падрыхтавала мультымедыйную прэзентацыю. Свята ўпрыгожылі выступленні віцебскіх калектываў: народнага ансамбля народных танцаў «На ростанях», узорнага дзіцяча-юнацкага тэатра «Мара», ансамбля цымбалістаў «Гукі сонца», тэатра мініяцюр «Пілігрымы», гурта эстраднай песні «Новае пакаленне» і інш.

10 лістапада ў культурна-асветніцкім цэнтры «Гарадок» была праведзена літаратурна-музычная вечарына, прысвечаная 135-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Мерапрыемства было падрыхтавана клубнымі і бібліятэчнымі работнікамі для вучняў і настаўнікаў устаноў адукацыі райцэнтра.

КЛУБНАЯ СПРАВА

«Для згоды людской збіраем сяброў» – пад такой назвай у Мазалаўскім СДК адбылося свята беларускай нацыянальнай культуры. Мерапрыемства арганізавалі мясцовыя культработнікі для новых удзельнікаў клуба інтэрнацыянальнага сяброўства «Згода» – замежных студэнтаў з Грэцыі, Лівана, Палесціны, Саудаўскай Аравіі і Шры-Ланкі. Праграма мерапрыемства ўключала канцэрт з удзелам народнага ансамбля народнай песні і музыкі «Вераснянка», майстар-класы па ігры на народных інструментах і вырабе лялек-абярэгаў, экскурсіі і інш. (*Витьбичи. – 2017. – 16 нояб. – С. VI.*)

4 лістапада загадчык Галубіцкага цэнтра культуры Глыбоцкага раёна Наталля Молакава і творчы калектыў установы культуры наладзілі

свята вёскі Слабада, прымеркаванае да 100-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі.

7 лістапада новую пастаноўку па матывах п'есы Янкі Купалы «Паўлінка» браслаўчанам прэзентаваў народны тэатр Браслаўскага РДК. Калектыў самадзейных артыстаў упершыню паказаў спектакль на Днях беларускай культуры ў Латвіі ў мінулым месяцы. Жыхары Браслава таксама высока ацанілі старанні мясцовых акцёраў.

Калектыў народнага тэатра гульні «Балаболы» Коханаўскага гарпасялковага Дома культуры Талачынскага раёна ажыццявіў пастаноўку новага лялечнага спектакля «Казка сонечнай краіны», з якім паспяхова выступаў перад выхаванцамі дзіцячых садкоў і вучнямі школ гарпасёлка і райцэнтра ў час восеньскіх канікулаў.

11 лістапада ў аграгарадку Зялёнка Полацкага раёна ў другі раз было праведзена народнае свята «Кузьмінкі». Арганізатары – Зялёнкаўскі СДК і Полацкі раённы Цэнтр культуры. У праграме свята: «Куриные именины», «Умасливание Кузьмы», «Кузьминковские игрища», тэатралізаванае прадстаўленне «Бабий заговор» народнага тэатра мініяцюр Зялёнкаўскага СДК.

Адметным творчым святам у Езярышчанскім Доме культуры Гарадоцкага раёна ўзгадалі імя ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, шматгадовага ўдзельніка народнага фальклорнага калектыву «Азерыца», скрыпача-самавука Рыгора Бацюлёва. У праграме: выставы народных рамёстваў і традыцыйных страў Гарадоччыны, фотаздымкаў з гісторыі мясцовага ансамбля народных інструментаў, паказ відэафільма «Скрыпач з Езярышча».

12 лістапада ў Пастаўскім Доме культуры па вул. Станкевіча адбылося шоу першакласнікаў з удзелам прадстаўнікоў усіх школ горада. У мерапрыемстве былі задзейнічаны дзіцячы духавы аркестр, цыркавая студыя «Каскад», танцавальныя калектывы дзіцячай школы мастацтваў і інш.

«Мая Беларусь» – пад такой назвай прайшоў першы справаздачны

№ 1. На ўрачыстай вечарыне сабраліся разам сённяшнія і былыя выкладчыкі, выпускнікі, новае пакаленне вучняў і іх бацькі, пачэсныя госці.

Выкладчыкі і выхаванцы Докшыцкай ДШМ імя Н. Сакалоўскага здзейснілі пастаноўку мюзікла «Снежная каралева» па казцы Андэрсэна. Прэм'ера адбылася на каталіцкія Каляды ў кіна-канцэртнай зале «Іскра» райцэнтра.

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

У рамках святкавання 419-й гадавіны г. Барані было прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Барані» мастаку-жывапісцу, члену ГА «Беларускі саюз мастакоў» **Мікалаю Іванавічу Тарандзе**.

У Аршанскім музеі У. Караткевіча **ў лістападзе** экспанавалася выстава «Бог жыве…» па выніках рэспубліканскага пленэру «Сівая легенда», прысвечанага 950-годдзю Оршы. Сваё жывапіснае прысвячэнне Аршаншчыне стварылі 9 мастакоў-рэалістаў. На карцінах – знакавыя мясціны, вядомыя людзі рэгіёна.

Навучэнцы Дзіцячай мастацкай школы горада Віцебска прымалі ўдзел у II Міжнародным конкурсе юных мастакоў «Республика детства – «Артек» вчера, сегодня, завтра» і былі адзначаны дыпломамі, а Мацвей Юхнавец заваяваў Гран-пры ў намінацыі «Завтрашний день республики детства – «Артек».

14 лістапада ў выставачнай зале Гарадоцкага краязнаўчага музея адкрылася выстава работ выкладчыкаў кафедры выяўленчага мастацтва мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П. М. Машэрава пад назвай «Традыцыі і сучаснасць».

У Арт-цэнтры Марка Шагала **ў лістападзе** адкрылася выстава графічных твораў студэнтаў і выкладчыкаў кафедры графікі Латвійскай акадэміі мастацтваў.

У аршанскай галерэі «Каляровы шлях» **у лістападзе-снежні**

МАСТАЦТВА

4 лістапада Міёрская дзіцячая школа мастацтваў адзначыла свой 50-гадовы юбілей. Багатая фотагалерэя, бліскучая лічба 50 на майках юных танцораў, сувеніры для гасцей, цёплыя віншаванні, запамінальныя нумары – усё гэта складнікі юбілейнай урачыстасці, якая адбылася ў раённым Доме культуры. (*Міёрскія навіны. – 2017. – 11 лістап. – С. 4–5.*)

4 лістапада паўвекавы юбілей адсвяткавала Новалукомльская дзіцячая школа мастацтваў. Юбілейны канцэрт адбыўся на сцэне Палаца культуры горада энергетыкаў. Адбылося ўшанаванне педагогаў і ветэранаў школы-юбіляра. Каштоўныя падарункі і сувеніры ўручылі прадстаўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў горада. Музычныя нумары дарылі выпускнікі і сённяшнія навучэнцы школы мастацтваў. Упершыню на вялікай сцэне прагучаў гімн Новалукомльскай ДШМ.

У рамках святкавання 40-годдзя Наваполацкай дзіцячай мастацкай школы імя І. Ф. Хруцкага ва ўстанове **на працягу лістапада** экспанавалася выстава «Ступені майстэрства». На ёй былі прадстаўлены работы некалькіх пакаленняў настаўнікаў – ад заснавання школы да сённяшняга дня. У экспазіцыі – графіка, жывапіс, дэкаратыўна-прыкладная творчасць.

Лепшым дызайнерам мужчынскага адзення ў Беларусі прызнана віцебскі мадэльер, дацэнт кафедры дызайну і моды Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта **Людміла Тараканава**.

8 снежня ў Шаркаўшчыне ў другі раз прайшоў адкрыты рэгіянальны фестываль ансамблевай музыкі «Вясёлка сугуччаў», які зарадзіўся ў мінулым годзе ў рамках пагаднення аб супрацоўніцтве рэгіёнаў Беларусі, Латвіі і Літвы, што ўваходзяць у Еўрарэгіён «Азёрны край». На сцэне раённага Цэнтра культуры выступілі 24 калектывы з дзіцячых школ мастацтваў Віцебшчыны, Шпогскай і Наўенскай музычных і мастацкіх школ (Латвія). 130 юных музыкантаў выступілі ў чатырох намінацыях і прадэманстравалі віртуознае майстэрства.

Сваё 80-годдзе адзначыла Аршанская дзіцячая школа мастацтваў

канцэрт устаноў культуры Лёзненшчыны ў Доме культуры аграгарадка Дабрамыслі. Прысутныя мелі магчымасць перад пачаткам канцэрта паглядзець старадаўні беларускі абрад «Прысяд дзіцяці», праведзены аматарскім аб'яднаннем пажылых людзей «Традыцыя». Госці пазнаёміліся з выставай работ майстроў народнай творчасці народнага клуба творчай інтэлігенцыі «Вдохновение» і фотаальбомамі калектываў Дома культуры.

24 лістапада свой 115-гадовы юбілей адзначыў народны тэатр Аршанскага Дома культуры чыгуначнікаў. Тэатральны калектыў і яго мастацкага кіраўніка Дзмітрыя Лецюка віншавалі творчыя калектывы і салісты ўстаноў культуры Оршы і Віцебска.

30 лістапада на сцэне Палаца культуры ААТ «Нафтан» адбыўся ўрачысты вечар з нагоды 50-годдзя ўстановы культуры.

У Полацкім раённым Цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур прайшоў творчы вечар Ноны Котавай, кіраўніка народнага ансамбля беларускай песні і музыкі «Полацкія россыпы» і народнага духоўна-патрыятычнага ансамбля «Спадчына». (*Полацкі веснік. – 2017. – 24 лістап. – С. 7.*)

3 снежня ў Лёзненскім раённым Цэнтры культуры быў з поспехам праведзены другі тур праекта пераўвасабленняў і пародый «Точь-в-точь по-лиозненски».

8 снежня вядучы творчы калектыў Гарадоцкага раёна, народны ансамбль песні і танца «Яблынька» Гарадоцкага гарадскога Дома культуры атрымаў ганаровае званне – «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь».

14 снежня ў Расонскім раённым Цэнтры культуры і народнай творчасці была праведзена конкурсная шоу-праграма «Парад профессий» з удзелам прадстаўнікоў сямі калектываў. Перамога прысуджана камандзе «Уголек» Расонскага РАНС і «Импульс» Расонскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Самадзейныя артысты драматычнага тэатра Глыбоцкага цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці ажыццявілі пастаноўку

спектакля па п’есе Сяргея Кавалёва «Стомлены д’ябал». Рэжысёр Алена Шынкевіч. (*Веснік Глыбоччыны. – 2017. – 20 снеж. – С. 8.*)

У снежні адзначалася 75-годдзе вызвалення г. п. Бягомль ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У Доме культуры гарпасёлка было праведзена мерапрыемства з нагоды гістарычнай даты. Тэме героіка-патрыятычнага выхавання была прысвечана выстава ў фае ўстановы культуры. Прысутным быў прадэманстраваны фільм «Бягомльская легенда». Адбыўся прыём школьнікаў у члены ГА «БРСМ».

Дырэктар Дзісенскага гарадскога Цэнтра культуры Аляксей Астукевіч падрыхтаваў музычную праграму, з якой выступіў у Апочацкім Доме культуры Пскоўскай вобласці. Песні «Мы завёмся беларусы», «Бульба», «Каханая дзяўчына» і іншыя гучалі на падвядзенні вынікаў конкурсу «Прадпрымальнік года».

У снежні на базе народнага аматарскага аб’яднання аўтарскай песні і паэзіі «Гармонія», які дзейнічае пры Доме культуры аграгарадка Дабрамыслі Лёзненскага раёна, быў створаны тэатр песні «Актава». Калектыў з поспехам выступіў у вёсках Крынкі, Стасева і Якубаўшчына, што на Лёзненшчыне.

У пачатку снежня было праведзена традыцыйнае брэндавае мерапрыемства ў аграгарадку Казяны Браслаўскага раёна. У мясцовы клуб-бібліятэку запрасілі жыхароў на свята вёскі. Гучалі вершы і песні ў выкананні самадзейных артыстаў. Віншавалі юбіляраў, ушаноўвалі доўгажыхароў і прадстаўнікоў розных прафесій. Былі арганізаваны выставы прыкладнога мастацтва і страў.

Выстава «Лянок валакністы» адкрылася **на пачатку снежня** ў Шаркаўшчынскім раённым Цэнтры рамёстваў. У выставачнай зале была прадстаўлена вялікая колькасць экспанатаў: ад самога лёну і інструментаў для яго першачарговай апрацоўкі да ткацкага станка і нацыянальных касцюмаў, уласцівых для рэгіёна.

17 снежня ў Гаранскім СДК Полацкага раёна была праведзена этнавечарынка «Агледзены нявест». Арганізатары – работнікі Полацкага

дзяржаўным універсітэце адбылося адкрыццё скульптурнай кампазіцыі «ГіПар». Інсталяцыя прысвечана Году навукі і ўвасабляе сінтэз сучаснага мастацтва і навуковага пазнання.

28 лістапада ў в. Чарэя Чашніцкага раёна адбылося ўрачыстае адкрыццё памятнага знака Оскару Мілашу, вядомаму французскаму паэту, ураджэнцу Чарэі.

У лістападзе адбылося пасяджэнне Полацкага райвыканкама, прысвечанае ахове гісторыка-культурнай спадчыны Полацка і Полацкага раёна, развіццю іх турыстычнага патэнцыялу. Удзел у пасяджэнні прынялі галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Дзяніс Юрчак і дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля Гуйвік. (*Полацкі веснік. – 2017. – 24 лістап. – С. 2.*)

2 снежня ў Расонскім музеі баявой садружнасці адкрылася выстава «История края в лицах». У экспазіцыі прадстаўлены партрэты знакамітых землякоў – Герояў Савецкага Саюза і Герояў Сацыялістычнай працы.

23 снежня, у рамках святкавання Дня вызвалення г. Гарадка і Гарадоцкага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, адбылося ўрачыстае адкрыццё Народнага музея Баявой Славы СШ № 1 г. Гарадка. У цырымоніі прыняў удзел старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў У. У. Цярэнцьеў.

Напярэдадні Новага года ў Віцебскім музеі гісторыі прыватнага калекцыяніравання адкрылася выстава антыкварнай елачнай цацкі. У экспазіцыі прадстаўлена каля 500 навагодніх упрыгажэнняў з прыватнага збору віцяблянкі Наталлі Кавалёвай.

Музей міфалогіі Бярэзінскага біясфернага запаведніка ўвайшоў у спіс самых незвычайных і арыгінальных дамоў Рэспублікі Беларусь у 2017 годзе.

выстава рэдкіх значкоў з выявай Леніна з калекцыі віцяблянiна Анатоля Шэльцына, якую ён перадаў у дар Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею напрыканцы мінулага стагоддзя. На адкрыцці выставы адбыўся адкрыты дыялог паміж ветэранамі камсамола і членамі БРСМ. «Встреча поколений. Это наша с тобою страна, это наша с тобой биография» – пад такой назвай прайшоў адкрыты дыялог моладзі і прадстаўнікоў старэйшага пакалення ў Полацкім музеі беларускага кнігадрукавання. У Шумілінскім гісторыка-краязнаўчым музеі на працягу лістапада праходзіла выстава «Вялікае свята мінулых гадоў – 7 лістапада». У музеі гісторыі і культуры Наваполацка адкрылася выстава «Чырвоны дзень календара». Работнікі Чашніцкага гістарычнага музея пры садзейнічанні раённага савета ветэранаў арганізавалі выставу «Октябрь. Революция. Мы».

У Віцебскім абласным краязнаўчым музеі адкрылася выстава, прысвечаная 100-годдзю абласной газеты «Витебские вести», якая з'яўляецца праваперaемнікам газет «Віцебскі рабочы» і «Народнае слова».

10 лістапада ў Глыбокім урачыста адкрылі памятную стэлу ў гонар 100-годдзя беларускай міліцыі. Памятная пліта з надпісам «Служым закону, народу, Айчыне» ўпрыгожыла парк Перамогі райцэнтра.

Адкрыццё музея гісторыі гарадской міліцыі ў будынку Наваполацкага ГАУС было прымеркавана да Дня ўшанавання ветэранаў органаў унутраных спраў.

У Віцебскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі адкрылася выстава, прысвечаная 110-годдзю з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза Івана Паўлавіча Собалева, ураджэнца в. Шапуры Віцебскага раёна.

16 лістапада ў Паставах прайшла цырымонія перапахавання астанкаў сямі воінаў, якія загінулі ў час Першай сусветнай вайны на тэрыторыі раёна. Затым быў здзейснены аўтапрабег па месцах пахаванняў салдат Рускай імператарскай арміі. Удзельнікі мерапрыемства наведалі фотавыставу «Першая сусветная вайна на Пастаўшчыне» ў палацы Тызенгаўзаў.

17 лістапада, у Міжнародны дзень студэнтаў, у Полацкім

раённага Цэнтра культуры, Гаранскага СДК і Гаранскага сельсавета. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел прадстаўнікі 13 сельсаветаў раёна. Святочны настрой стваралі народны ансамбль народнай песні «Заманіха» Полацкага РЦК, фальклорны ансамбль «Карусель» ДШМ Полацкага раёна, ансамбль песні «Фярцінка» Багатырскага СДК.

У снежні работнікі Дубровенскага РДК правялі конкурсную шоу-праграму «А ну-ка, теща!».

Аўтаклуб Полацкага раённага Цэнтра культуры (кіраўнік Таццяна Хутарная) разам з сельскімі ўстановамі культуры распачаў праект «Мабільны навагодні клуб на колах». Першая сустрэча ў «Гасцёўні Дзеда Мароза» прайшла ў Зялёнкаўскім СДК. У праграме: тэматычны канцэрт «Раство прыходзіць у кожны дом», выстава навагодняй тэматыкі, «сувенірная лаўка» і інш.

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

3 лістапада ў Віцебску адбылося абласное свята нацыянальных культур, беларускай кухні і гульні «Нас з'яднала зямля Беларусі». Прадстаўнікі 12 нацыянальнасцей з 18 раёнаў вобласці ўдзельнічалі ў святочным аглядзе народнай творчасці, музыкі, танца, кулінарнай традыцыі. У культурна-гістарычным комплексе «Залатое кольца горада Віцебска «Дзвіна» былі разгорнуты 3 пляцоўкі: «Майстровая» (майстар-класы і выстава-продаж вырабаў майстроў народных рамёстваў); «Смачная» (14 клубаў нацыянальнай кухні прэзентавалі свае стравы); «Канцэртна-святочная» (канцэртная праграма ўдзельнікаў творчых калектываў і індывідуальных выканаўцаў з усіх рэгіёнаў вобласці). На свята былі запрошаны вядомы дырыжор, фалькларыст, этнограф Міхаіл Дрынеўскі і старшыня Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці Яўген Сахута. Лепшыя прадстаўнікі Віцебшчыны прымуць удзел у Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур.

11 лістапада ў Сенненскім раённым Цэнтры культуры і народнай

творчасці адбылося IV абласное свята-конкурс аматарскіх лялечных тэатраў «Лялечны свет». Адкрылі творчы марафон батлейкі, затым на сцэну з дапамогай лялькаводаў выйшлі героі вядомых казак. У перапынках гледачоў забаўлялі роставыя лялькі, якія спаборнічалі ў конкурсе пад назвай «Тэатральны балаган». Журы прызнала лепшымі ўзорны тэатр «Батлейка» Шумілінскага раённага Дома рамёстваў, народны лялечны тэатр «Вытворяшки» Пастаўскага РДК, народны тэатр лялек «Капялюш» Наваполацкага ГЦК. У рамках тэатральнага свята прайшла дабрачынная акцыя «Лялечны свет – дзецям».

У пачатку лістапада на сцэне Дубровенскага РДК адбыўся штогадовы агляд-конкурс танцавальных калектываў раёна «Хрустальный башмачок-2017». Па выніках выступленняў 10 калектываў Гран-пры конкурсу быў прысуджаны танцавальнаму калектыву «Забава» Дубровенскай дзіцячай школы мастацтваў.

Студэнцкая моладзь г. Віцебска выяўляла таленты на традыцыйных фестывалях: «Залатая мелодыя восені» (ВДТУ), «Студэнцкая восень ВДМУ», «Арт-восень ВДУ».

9 раёнаў Віцебскай і Магілёўскай абласцей аб'яднаў IV міжрэгіянальны фестываль народнай творчасці ветэранаў «Песня збірае сяброў», праведзены на сцэне Аршанскага Дома культуры «Победа».

6 снежня ў Дубровенскім РДК адбыўся конкурс вакальна-харавых калектываў «Галасы зямлі Дубровенскай». 9 калектываў прадэманстравалі сваё вакальнае і акцёрскае майстэрства, яркія і самабытныя касцюмы. Пераможца – фальклорная група «Грамніцы» раённага Дома рамёстваў.

15 снежня Лепель прымаў удзельнікаў абласнога фальклорнага форуму. У яго рамках адбыліся прэзентацыі разнастайных народных клубаў, якія дзейнічаюць пры ўстановах культуры вобласці, гала-канцэрт удзельнікаў агляду-конкурсу фальклорных калектываў, а таксама навукова-практычная канферэнцыя «Традыцыйны фальклор у сучаснасці». Суквецце традыцыйных беларускіх арнаментаў сабрала выстава-конкурс традыцыйнай вышыўкі «Юбілейныя сімвалы»,

24 снежня ў час зімовых канікул з удзельнікамі клуба па інтарэсах «Сябры кнігі» бібліятэкі «Дабееўскі мох» была праведзена інфармацыйная гадзіна «Як свет сустракае Новы год».

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

На пасяджэнні прэзідыума Чашніцкага раённага Савета дэпутатаў была разгледжана работа па захаванні гісторыка-культурных каштоўнасцяў, якая вядзецца на тэрыторыі раёна. (*Чырвоны прамень. – 2017. – 14 лістап. – С. 3.*)

1–2 лістапада 50-годдзю Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка была прысвечана VII Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі», якая сабрала многіх вядомых навукоўцаў Беларусі і замежжа (*Полацкі веснік. – 2017. – 28 лістап. – С. 6.*). У музеі беларускага кнігадрукавання экспанавалася выстава «Захоўваючы – памнажаем», прымеркаваная да юбілейнай даты.

2 лістапада ў Гарадоцкім раённым краязнаўчым музеі былі праведзены курсы для навуковых супрацоўнікаў па тэме «Інавацыйная дзейнасць сучаснага музея». 14 прадстаўнікоў розных устаноў культуры Віцебшчыны пазнаёміліся з вопытам работы музея, экспазіцыямі, пабывалі на экскурсіі ў фондасховішчы, паглядзелі фільм пра тэхніку ажурнага ткацтва – нематэрыяльнай спадчыны Беларусі.

Да 100-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі адкрылася выстава «Эпоха Леніна». У экспазіцыі прадстаўлена каля 1000 прадметаў з музейнага збору полацкага калекцыянера Мікалая Панкрата. У Полацкім краязнаўчым музеі адкрылася выстава пад назвай «Ленин жил! Ленин жив? Ленин будет жить?..». Экспазіцыя адлюстроўвае гістарычныя перыпетыі праз прызму Полацка. У Віцебскім музеі прыватнага калекцыяніравання адкрылася

Міжнароднага дня барацьбы са СНІДам у бібліятэках былі афармлены кніжныя выставы «Скажи СПИДу – нет!», «Остановись – СПИД!».

ДУК «Ушацкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У Кубліцкай бібліятэцы-філіяле № 15 імя Васіля Быкава **3 лістапада** было праведзена пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Беларускай зямлі валаты», прысвечанае 135-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа.

20 снежня ў дзіцячай бібліятэцы была арганізавана літаратурная гульня «Добро пожаловать в Простоквашино» па кнізе Э. Успенскага.

ДУК «Чашніцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Загадчык Чарэйскай сельскай бібліятэкі Т. Казлоўская падрыхтавала кніжную выставу, прысвечаную творчасці Оскара Мілаша, да ўрачыстай цырымоніі адкрыцця памятнага знака знакамітаму ўраджэнцу Чарэі **28 лістапада**.

ДУК «Шаркаўшчынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У лістападзе да 115-гадовага юбілею пісьменніка Міхася Машары, ураджэнца Шаркаўшчынскага раёна, у Германавіцкай бібліятэцы была праведзена літаратурная імпрэза «Наш славуты зямляк».

29 лістапада сярод бібліятэчных работнікаў ЦБС быў арганізаваны конкурс чытальнікаў вершаў пад назвай «ПаКаласімся!». За права стаць лепшымі чытальнікамі змагаліся не толькі бібліятэкары, але і актыўныя чытачы.

ДУК «Шумілінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

10 лістапада ў чытальнай зале дзіцячай бібліятэкі прайшла гульня-падарожжа «Аленушкины сказки» да 105-годдзя з дня нараджэння пісьменніка Д. Н. Маміна-Сібірака.

прысвечаная 80-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці. На форуме пацвердзілі свае званні заслужаныя аматарскія калектывы Рэспублікі Беларусь: узорны фальклорны калектыў «Сунічкі» Стайскай дзіцячай школы мастацтваў традыцыйнай культуры і народны клуб майстроў і мастакоў «Скарбонка» Лепельскага Дома рамёстваў. Завяршылася мерапрыемства акцыяй «Пояс сяброўства». (*Лепельскі край. – 2017. – 29 снеж. – С. 12.*)

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

У рамках Дзён мастацтва і культуры Латвіі ў Віцебску **2 лістапада** адбылося адкрыццё выставы «Геральдыка Латвіі» (муніцыпальныя, фамільныя і карпаратыўныя гербы 1993–2017) латвійскіх мастакоў Ілзэ Лібіетэ і Юрыса Іванова. На адкрыцці выставы прысутнічаў кіраўнік Консульства Латвійскай Рэспублікі ў Віцебску Угіс Скуя.

9 лістапада прайшлі чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада». Тэма заняткаў: «Віцебск – горад на Дзвіне». Лектарамі выступілі галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама, кандыдат гістарычных навук Дзяніс Юрчак і вядучы архівіст Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці Святлана Мясаедава.

14 лістапада адбылася літаратурна-музычная вечарына да 135-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа «Пад небам Песняра». Імпрэза пачалася чароўнай кампазіцыяй «Мой родны кут» у выкананні трыа выкладчыкаў ДШМ № 1 г. Віцебска. Перад прысутнымі выступілі старшыня Віцебскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Тамара Краснова-Гусачэнка, паэты Мікалай Намеснікаў, Вольга Русілка, Алена Гінько. Да юбілею Я. Коласа

Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеем Якуба Коласа быў абвешчаны конкурс сярод навучэнцаў «Жыве паэт між намі тут», у якім прынялі ўдзел і юныя паэты з Віцебска. На вечарыне прагучалі вершы вучаніцы СШ № 45 Ганны Аношкі і навучэнкі гімназіі № 7 Анастасіі Макаўцовай. Імя Якуба Коласа з 1944 года носіць драматычны тэатр у Віцебску. Пра пастаноўкі коласаўскіх твораў на сцэне тэатра расказаў тэатразнаўца, літаратурны рэдактар тэатра імя Я. Коласа Юрый Іваноўскі. Народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Тадэвуш Кокштыс выканаў урывак з ролі Жабрака па п'есе «Сымон-музыка» і падзяліўся сваімі ўспамінамі пра сустрэчы з роднымі Якуба Коласа на радзіме паэта. Родныя мясціны Якуба Коласа паўсталі на кадрах відэафільма «Шлях паэта», а на развітанне прагучаў голас Песняра.

15 лістапада ў рамках бібліятэчнага праекта «Разам!» прайшоў літаратурна-музычны вечар «Акорды душы», прымеркаваны да Міжнароднага дня сляпых.

16 лістапада ў рамках міжнароднага літаратурна-адукацыйнага праекта «Смаленска-Віцебскі трансфер: экалагічныя канцэпцыі гарадоў-пабрацімаў» адбылося пасяджэнне «круглага стала», якое прайшло ў Смаленскай абласной універсальнай навуковай бібліятэцы імя А. Т. Твардоўскага. У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі экалагічнай грамадскасці саюзных краін, выкладчыкі, студэнты, бібліятэкары.

19 лістапада ў сектары замежнай літаратуры адбыліся гучныя чытанні кніг сусветна вядомага фінскага пісьменніка і мастака Маўры Кунаса ў рамках Міжнароднага праекта «Паўночныя чытанні». У мерапрыемстве ўзялі ўдзел школьнікі ДУА «Гімназія № 2 г. Віцебска» і студэнты УА «Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт».

23 лістапада ў бібліятэцы прайшла III Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Віцебскі край», прысвечаная 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. Арганізатарамі канферэнцыі выступілі

ДУК «Пастаўская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

14 лістапада на базе Камайскай сельскай бібліятэкі адбыўся семінар бібліятэчных работнікаў «Сумесная работа ўстаноў культуры па арганізацыі разнастайных мерапрыемстваў у сельскай мясцовасці». Паказальнае мерапрыемства «Прекрасен мир любови материнской» – яскравы прыклад паспяховага супрацоўніцтва бібліятэкі з Камайскім СДК, Камайскай СШ і дзіцячым садком.

28 лістапада прайшло пасяджэнне клуба «Сучаснікі» пры ЦРБ, якое было прысвечана творчасці Рымы Казаковай, Бэлы Ахмадулінай, Марыны Цвятаевай і мела назву «Даруют людям жаркий сердца дар…».

14 снежня ў ЦРБ адбылася прэзентацыя кнігі І. М. Пракаповіча «Край беларускага сэрца – Мядзельшчына». У гэты ж дзень адбылася інфармацыйная гадзіна «На шляху да Ражства» з удзелам кіраўніка нядзельнай школы царквы Святога Мікалая ў Паставах Ірыны Калесень.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Расонскага раёна»

Работнікі сістэмы пачалі выкарыстоўваць новую форму работы – «бібліядэсант». З мэтай прыцягнення прадстаўнікоў рознага ўзросту да кнігі і чытання арганізуюцца сустрэчы з творчымі людзьмі. У снежні ў Заборскім СДК выступілі члены народнага клуба самадзейных паэтаў «Натхненне» Надзея Кожар і Аляксандр Матошка, а таксама аўтары вершаў Зінаіда Ступакова, Вольга Бацьянава і Лідзія Дадзека.

ДУК «Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Да 135-годдзя Я. Купалы і Я. Коласа ў ЦРБ было арганізавана квэст-падарожжа «На кожнай сцяжынцы іх голас і песня»; у дзіцячай бібліятэцы быў паказаны лялечны спектакль «А пачнем мы казку так…» па казцы Я. Коласа.

Работнікі сістэмы прынялі ўдзел у дабрачыннай акцыі «Творить добро на всей земле», прымеркаванай да Міжнароднага дня інвалідаў. Да

ДУК «Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

3 лістапада ў бібліятэцы імя А. Герцена прайшла паэтычная гадзіна «Ад роднае зямлі, ад гоману бароў», прысвечаная 135-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа.

3 лістапада ў бібліятэцы імя Я. Купалы прайшло чарговае пасяджэнне клуба «Тепло сердец» на тэму «Блажен, кто память предков чтит», у рамках якога адбылася сустрэча з айцом Аляксандрам, настаяцелем Богаяўленскага сабора. **17 лістапада** ў дзіцячым аддзеле гэтай бібліятэкі ў рамках праграмы «Далучыць да роднага слова» прайшла літаратурная вандроўка «На кожнай сцяжынцы іх песня і голас» (да 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа).

«Дзве зоркі беларускай літаратуры» – пад такой назвай **22 лістапада** ў канферэнц-зале ЦБ імя Ф. Скарыны прайшла літаратурна-музычная вечарына, прысвечаная 135-годдзю з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа.

1 снежня ў рамках краязнаўчага плана «Мая Полаччына» ў бібліятэцы-філіяле № 8 прайшла краязнаўчая гадзіна «Стагоддзі і людзі тут пакінулі свой след…», прысвечаная гісторыі Полацкага езуіцкага калегіума.

1 снежня ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога для вучняў 8 Б класа СШ № 10 прайшоў экскурс у мастацтва «Ушедшие времена на великих полотнах».

6 снежня да Сусветнага дня барацьбы са СНІДам у бібліятэцы імя Я. Купалы было праведзена мультымедыйнае мерапрыемства «Маршрут бяспекі», у бібліятэцы-філіяле № 5 прайшоў «круглы стол» з вучнямі адзінаццатага класа на тэму «Паядынак са СНІДам».

24 снежня ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога прайшоў навагодні ранішнік «Зімовая казка» для дзяцей, якія наведваюць заняткі «Чытанне з пялёнак».

Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна, ВДУ імя П. М. Машэрава, Віцебскі абласны краязнаўчы музей. У канферэнцыі прынялі ўдзел навукоўцы, гісторыкі, архівісты, краязнаўцы, прадстаўнікі духавенства, музейныя работнікі, выкладчыкі з Беларусі і Латвіі. У час канферэнцыі Віцебская вобласць атрымала ў дар унікальнае факсімільнае выданне «Кніжная спадчына Францыска Скарыны», якое налічвае 20 тамоў. На працягу канферэнцыі працавалі чатыры секцыі: «Гістарычнае краязнаўства», «Культурна-асветныя ўстановы і ўстановы адукацыі ў сістэме сучаснага краязнаўства», «Рэлігійнае краязнаўства», «Літаратурнае краязнаўства. Этнаграфія. Фальклор «.

23 лістапада адбыліся чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада» на тэму «Гісторыя Віцебска на старонках «Віцебскіх сшыткаў» (1–5)». Праз 17 год пасля выхаду ў свет чацвёртага нумара адноўлена выданне гістарычнага навукова-папулярнага альманаха «Віцебскі сшытак». Пяты нумар выдання прэзентавала рэдактар альманаха Людміла Хмяльніцкая.

25 лістапада ў сектары замежнай літаратуры прайшла краязнаўчая гадзіна «Нашы бліжэйшыя суседзі: Латвія», прымеркаваная да Дня Незалежнасці Латвіі. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел школьнікі ДУА «Гімназія № 1 г. Віцебска».

30 лістапада ў аддзеле літаратуры па мастацтве адбылася творчая сустрэча «Слова авангарда і рэвалюцыі», прысвечаная 100-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года.

2 снежня ў аддзеле літаратуры па мастацтве лаўрэаты расійскіх і міжнародных конкурсаў Аліна Сярогіна і Сяргей Лявонцьеў (творчы дуэт «Востраў», г. Масква) прадставілі літаратурна-музычную праграму «Маё сонца».

6 снежня адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Еўразійскага бібліятэчнага інтэрнэт-форуму «Моладзь і кніга – за мірную будучыню» ў рамках міжнароднага праекта «Дыялог

нацыянальных літаратур». Галоўнай узнагароды міжнароднага этапу інтэрнэт-форуму ўдастоены Аляксей Глазман, чытач Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна, – аўтар буктрэйлера «Неизвестный Освенцим» па кнізе Прыма Леві «Чалавек гэта?». Дыпломамі ўзнагароджаны таксама аўтары электроннай выставы, якая заняла другое месца ў міжнародным этапе конкурсу электронных кніжна-ілюстрацыйных выстаў «Бласлаўёныя міратворцы на зямлі» ў намінацыі «Бібліятэкар»: загадчык электроннай чытальнай залы Інга Данчанка і вядучы бібліятэкар электроннай чытальнай залы Ганна Бязусава.

7 снежня ў рамках бібліятэчнага праекта «Адлюстраванне» адбылося адкрыццё мастацкай выставы мастацтвазнаўца, мастака Міхаіла Цыбульскага «Мімалётныя ўражанні. Эцюды» (жывапіс).

14 снежня былі праведзены чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада» на тэму «Дом І. В. Вішняка і яго гісторыя». Пра гісторыю будынка напярэдадні адкрыцця музея Віцебскага народнага вучылішча расказала доктар мастацтвазнаўства Таццяна Катовіч, якая прадставіла на лекцыі сваю новую кнігу «Особняк Вишняка = школа Шагала».

14 снежня на ўрачыстай цырымоніі закрыцця міжнароднага адукацыйнага праекта «Смаленска-Віцебскі трансфер: экалагічныя канцэпцыі гарадоў-пабрацімаў», які быў рэалізаваны пры падтрымцы Нямецкага культурнага цэнтра імя Гётэ, былі падведзены вынікі мерапрыемства, узнагароджаны пераможцы конкурсу «Зробім зямлю чысцей!».

18 снежня ў рамках мерапрыемстваў XXIX Міжнароднага музычнага фестывалю імя І. І. Салярцінскага ў бібліятэцы адбылася сустрэча з мастацтвазнаўцам Дзмітрыем Салярцінскім, які падзяліўся з прысутнымі ўспамінамі пра бацьку і пісьменніка, народнага артыста СССР Іраклія Андронікава. Удзельнікам мерапрыемства быў прапанаваны фільм «Першы раз на эстрадзе».

ДУК «Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

8 і 29 лістапада ў цэнтральнай бібліятэцы быў праведзены тэматычны вечар «Іх подзвіг жывы, непаўторны і вечны» (да 100-годдзя з дня нараджэння легендарнага танкіста, ураджэнца Дубровеншчыны Андрэя Міхайлавіча Усава).

24 лістапада ў ЦРБ была арганізавана бібліяноч «Алиса в Стране Чудес» (да 185-гадовага юбілею Л. Кэрала) сумесна з РЦНТ і ДШМ імя Ф. Яруліна.

22 снежня ў Асінторфскай сельскай бібліятэцы – цэнтры экалагічнай асветы была праведзена гадзіна краязнаўства «Эпоха, лёс, памяць».

ДУК «Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

24 лістапада для сельскіх бібліятэкараў быў праведзены тэматычны семінар «Бібліятэчнае краязнаўства як фактар павышэння культурнага патэнцыялу рэгіёна. Развіццё турыстычнай прасторы».

ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

1 снежня, у рамках Сусветнага дня барацьбы са СНІДам, раённая бібліятэка правяла сумеснае мерапрыемства з БРСМ і аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лёзненскага райвыканкама «Веды супраць страху». На сустрэчу былі запрошаны вучні старэйшых класаў, першы сакратар БРСМ, настаўнікі, урач-эпідэміёлаг ДУ «Лёзненскі рай ЦГЭ».

ДУК «Міёрская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

23 лістапада ў ЦРБ разам з БРСМ быў арганізаваны адкрыты дыялог «Да духоўных вытокаў». Мерапрыемства было прымеркавана да святкавання 1025-годдзя ўтварэння Полацкай епархіі. На сустрэчу з працуючай моладдзю прыйшоў святар Міёрскага храма протаіерэй Віктар Вабішчэвіч.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Верхнядзвінскага раёна»

27 лістапада ў цэнтральнай раённай бібліятэцы адкрылася выстава «Мой сурвэтачны свет», дзе была прадстаўлена калекцыя сурвэтак Марыі Міцкевіча – начальніка аддзела адукацыі, спорту і культуры Дагдскага краю (Латвія).

ДУК «Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

30 лістапада ў ЦРБ адбыўся раённы семінар на тэму «Бібліятэка: новыя арыентыры дзейнасці». У праграме: сустрэча з краязнаўцам, дацэнтрам кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П. М. Машэрава М. В. Піваварам; кансультацыя «Сучасная бібліятэка: арыентыры на эфектыўнасць»; відэа-агляд творчых работ з раённага конкурсу «Гісторыя населеных пунктаў у беларускім алфавіце»; экспрэс-агляд «Краязнаўчы турызм – перспектыўны напрамак бібліятэчнай дзейнасці»; дзейнасць публічных бібліятэк у прававым асяроддзі; абмен вопытам і інш.

ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк»

6 снежня ўдзельнікі клуба «Золотой возраст» і ўсе жадаючыя завіталі ў літаратурна–музычную гасцёўню культурна-асветніцкага цэнтра «Гарадок» на літаратурна-музычны вечар «Пусть будет жизнь прекрасна» да Міжнароднага дня інвалідаў.

8 снежня ў Пальмінскай сельскай бібліятэцы да Міжнароднага дня інвалідаў адбылася гадзіна духоўнасці «Свет души рассеет тьму». Мерапрыемства было прысвечана інвалідам па зроку. Гучалі вершы Эдуарда Асадава, Міхаіла Суворава і інш.

27 і 29 снежня ў аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры цэнтральнай бібліятэкі быў праведзены гульнёвы падворак «Зімовыя забавы».

20 снежня ў рамках сумеснага праекта «Ад кнігі да фільма» музея «Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва» і абласной бібліятэкі адбылося пасяджэнне гарадскога народнага кінаклуба «Дыялог», на якім быў прадстаўлены фільм рэжысёра Дзмітрыя Зайцава «Хам» (экранізацыя рамана Э. Ажэшкі). У мерапрыемстве прыняла ўдзел заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Таццяна Ліхачова, якая падзялілася з гледачамі ўспамінамі пра свайго мужа, заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Генадзя Шкуратава, выканаўцу галоўнай ролі ў фільме.

21 снежня адбылося падвядзенне вынікаў штогадовай дабрачыннай акцыі «Подари радость чтения» па зборы кніг сярод чытачоў і супрацоўнікаў бібліятэкі для ДУСА «Сялюцкі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў». Больш за 500 кніг было перададзена ў бібліятэку гэтай установы.

22 снежня ў бібліятэцы была арганізавана сустрэча старшыні грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі», празаіка Мікалая Чаргінца з творчай інтэлігенцыяй горада.

23 снежня была праведзена традыцыйная літаратурна-музычная вечарына «Калядны вечар, Святы Вечар...», якую вёў празаік Франц Сіўко. Асаблівую ўрачыстасць вечарыне надала прысутнасць на ёй Біскупа Віцебскага Алега Буткевіча і канцлера дыяцэзіяльнай курыі ксяндза Віктара Місевіча. Усіх прысутных зачаравалі ўзнёслыя спевы вакальнай групы дыяцэзіяльнага хору «Гасанна».

27 снежня адбылася цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў «Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі» Віцебскага аблвыканкама. Вядучы цырымоніі – галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Дзяніс Юрчак. Лаўрэатаў прэміі Ганну Навасельцаву, Аркадзя Падліпскага, Тамару Краснову-Гусачэнку, Алену Фядзяеву павіншаваў з пачэснай узнагародай начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Генадзь Ягораў.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска»

У межах святкавання 135-гадовага юбілею Якуба Коласа дзіцячая бібліятэка, якая носіць імя народнага паэта Беларусі, падрыхтавала для сваіх чытачоў цыкл літаратурна-паэтычных мерапрыемстваў «Каласавіны».

15 лістапада адбылася святочная вечарына «Бібліятэка збірае сяброў», прысвечаная 50-годдзю дзіцячай бібліятэкі імя С. Маршака.

23 лістапада 40-гадовы юбілей сваёй установы адсвяткавалі супрацоўнікі бібліятэкі імя У. Караткевіча. У вечарыне «Скарбніца для вечных каштоўнасцяў» удзельнічалі віцебскія пісьменнікі, педагогі, навучэнцы Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў, работнікі школьных бібліятэк.

7 снежня ў аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў ТЦСАН Чыгуначнага раёна г. Віцебска адбылася ўрачыстасць «Бібліятэка збірае сяброў» з нагоды 70-годдзя бібліятэкі імя Я. Купалы. Павіншаваць юбіляраў прыйшлі чытачы, калегі і сябры бібліятэкі. Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага гарвыканкама Н. А. Шыянок дала высокую ацэнку дзейнасці бібліятэкі, як інфармацыйнага і культурнага цэнтра для жыхароў горада.

7 снежня ў бібліятэцы імя Е. Полацкай быў праведзены літаратурна-музычны вечар «Путь к храму» да 25-годдзя адраджэння Віцебскай епархіі.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка»

100-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі была прысвечана экспазіцыя «Отечество славлю, которое есть, но трижды – которое будет», якую супрацоўнікі ЦБ імя У. Маякоўскага правялі ў Цэнтры культуры. На выставе была прадстаўлена мастацкая літаратура, выданні, якія адлюстроўваюць гістарычны і сучасны шлях развіцця суверэннай Беларусі, паштоўкі кастрычніцкай тэматыкі савецкага перыяду, інсталяцыя пісьмовага стала інтэлігента тых далёкіх гадоў. **4–5 лістапада** ў бібліятэцы прайшоў паказ дакументальных фільмаў гісторыка-рэвалюцыйнай тэматыкі пад агульнай назвай «Революция 1917: две

стороны одной медали: историко-информационное досье».

Да 1025-годдзя Полоцкай епархіі **23 лістапада** ў ЦБ імя У. Маякоўскага быў праведзены гістарычны экскурс «Полацкая Епархия – вчера и сегодня» з удзелам Валерыя Рыжанкова – протаіерэя храма Святога Архангела Міхаіла.

Самай значнай падзеяй месяца ў ЦБС стала «Навагодняя феерыя», якая сабрала **16 снежня** ў ЦБ імя У. Маякоўскага на інтэрактыўных пляцоўках сотні прыхільнікаў казак: «Шчаўкунчык і Мышыны кароль», «Снягурка», «Зіма ў Прастаквашыне», «Снежная каралева», «Дванаццаць месяцаў».

22 снежня ў бібліятэцы імя Я. Коласа пачала працаваць інтэрактыўная навагодняя пляцоўка «Волшебная сказка». Усімі любімыя і знаёмыя зімовыя казкі сабраліся ў бібліятэцы. З іх дапамогай бібліятэкары падрыхтавалі для тых, хто верыць у цуды, незвычайную праграму, казачныя фотазоны, гульні, конкурсы, віктарыны.

ДУК «Бешанковіцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

На базе цэнтральнай раённай бібліятэкі прайшоў семінар сельскіх бібліятэкараў пад назвай «Бібліятэка – тэрыторыя здаровага ладу жыцця».

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна»

1–6 лістапада бібліятэкі ЦБС удзельнічалі ў правядзенні «Тыдня восеньскіх канікулаў». У цэнтральнай бібліятэцы **15 лістапада** была праведзена літаратурна-паэтычная гадзіна «Слаўны сын беларускай зямлі» да 135-гадовага юбілею Я. Коласа; **20–26 лістапада** быў арганізаваны Тыдзень прававых ведаў «З законам на ты».

19 снежня ў ЦРБ адбылася раённая нарада бібліятэкараў. Быў зроблены аналіз планаў работы бібліятэк на 2018 год, абмеркаваны мерапрыемствы да 80-годдзя ўтварэння Віцебскай вобласці і інш. У рубрыцы «Вучымся прафесіяналізму» выступілі бібліятэкары Гірэйшчынскай і Мяжанскай бібліятэк.